Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (148), 2025

УДК 94:327(438):316.647.8(=162.1)«1921-1939» EDN: DPSJTO

# Міжваенная Польшча як суб’ект міжнароднай палітыкі і міжнародных адносін: вобраз ва ўспрыманні беларусаў

А.М. Кротаў

Артыкул прысвечаны фарміраванню ў міжваенны час ва ўспрыманні беларусаў вобраза Польшчы як суб’екта міжнароднай палітыкі і міжнародных адносін. Аўтар робіць выснову, што вобразатворцы з БССР і Заходняй Беларусі хаця і не сумеснымі, але ж аднанакіраванымі намаганнямі стварылі вобраз дзяржавы, якая з’яўлялася чыннікам нестабільнасці ў Еўропе. Пераконваючы беларусаў у тым, што вялікадзяржаўныя амбіцыі Польшчы і спробы іх рэалізаваць павінны прывесці да фатальных для яе вынікаў, яны садзейнічалі ўкараненню ў іх грамадскай свядомасці ўпэўненасці ў непазбежным уз’яднанні Беларусі і беларускага народа.
**Ключавыя словы:** Польшча, Савецкая Беларусь, Заходняя Беларусь, міжнародная палітыка, міжнародныя адносіны, беларусы, нацыянальнае ўспрыманне, вобраз Польшчы.

The article is devoted to the formation of the Belarusians' perception of the image of Poland as a subject of international politics and international relations in the interwar period. The author concludes that the image-makers from the BSSR and Western Belarus created the image of the state, which was the cause of instability in Europe, by not joint, but single-minded efforts. Convincing the Belarusians that Poland's great-power ambitions and attempts to realize them must lead to fatal results for it, they contributed to instilling in their public consciousness confidence in the inevitable reunification of Belarus and the Belarusian people.
**Keywords:** Poland, Soviet Belarus, Western Belarus, international politics, international relations, Belarusians, national perception, image of Poland.

Нараджэнне беларускай дзяржавы і аднаўленне незалежнасці Польшчы адбылося ў адзін і той жа гістарычны момант. І адразу ж апошняя аспрэчыла права беларусаў на ўласную дзяржаўнасць. Рыжскі мірны дагавор 1921 г., які падвёў вынікі польска-савецкай вайны 1919–1920 гг., аформіў уключэнне ў склад Польшчы Заходняй Беларусі, што стала красамоўным сведчаннем яе стаўлення да дзяржаватворчых намаганняў беларусаў, да іх нацыянальных інтарэсаў і правоў. Падзел Беларусі не толькі асвяжыў у народнай памяці беларусаў успаміны аб крыўдах, прычыненых ім Польшчай у былыя часы, але і стаў эмацыйна-псіхалагічнай базай для фарміравання ў іх успрыманні вобраза новай, «паўсталай з попелу» Польшчы. У мэтах аб’ектывізацыі ўласных высноў беларускія вобразатворцы вельмі сур’ёзна вывучалі стаўленне да Польшчы іншых суб’ектаў міжнароднай палітыкі і міжнародных адносін, улічваючы яго ў сваёй працы па стварэнню вобраза, неабходнага для выкарыстання ў ідэалагічнай рабоце, накіраванай на развіццё грамадскай і палітычнай свядомасці беларусаў.

Як вядома, здабыццё незалежнасці з’яўляецца вызначальнай падзеяй у гісторыі любой краіны, якая знаходзілася пад уладай чужынцаў. Улічваючы ж трапяткое стаўленне палякаў да тэмы іх вызваленчай барацьбы, не павінна выклікаць здзіўлення, што пасля аднаўлення суверэнітэту польскай дзяржавы 11 лістапада 1918 г. іх ахапіла сапраўдная нацыянальная эйфарыя. Палякі былі перакананы, што Польшча атрымала незалежнасць не дзякуючы камусьці, а насуперак усім. Між тым, нельга не заўважыць, што чэхі і славакі, якія ніколі не змагаліся за сваю незалежнасць, атрымалі яе нават раней за іх – 28 кастрычніка 1918 г.

Нягледзячы на тое, што апякаючыя Польшчу дзяржавы Антанты адвялі ёй ролю буфера, які павінен быў стрымліваць распаўсюджванне бальшавізму, палякі мелі куды больш амбіцыйныя мэты, якія адразу ж паспрабавалі ажыццявіць. У выніку польска-савецкай вайны Польшча захапіла беларускія і ўкраінскія землі, што не супярэчыла інтарэсам яе апекуноў. Аднак што тычылася Віленшчыны, тут Пілсудскі выйшаў за межы «ўмоўна дазволенага». З яго негалоснай санкцыі камандзір 1-й Літоўска-беларускай дывізіі Люцыян Жалігоўскі «збунтаваўся» і 9 кастрычніка 1920 г. заняў Вільна і частку Паўднёва-Ўсходняй Літвы. Створаная ім на захопленых тэрыторыях марыянеткавая дзяржава – Рэспубліка Сярэдняй Літвы – праіснавала нядоўга. 24 сакавіка 1922 г. яна ўвайшла ў склад Польшчы.

Дзяржавы Антанты, якія стаялі за праектам польскага нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, разлічвалі на тое, што Польшча будзе паслухмяна і старанна выконваць галоўную сваю задачу – быць дзейнасным буферам паміж Еўропай і камуністычнай Расіяй, аб які будуць разбівацца «бальшавіцкія орды». Аднак яны не ўлічылі асаблівасці менталітэту палякаў, у якім Польшча існавала выключна як «вялікая». Невыпадкова адроджаную польскую дзяржаву ў польскай гістарыяграфіі называюць «Другой Рэччу Паспалітай», падкрысліваючы яе генетычную сувязь з папярэдніцай – Першай Рэччу Паспалітай, якая мела развітыя вялікадзяржаўныя амбіцыі. Дарэчы, у семантычнай сістэме польскай мовы, якая звязана з асаблівасцямі менталітэту палякаў, польская дзяржава існавала і існуе толькі ў выглядзе Рэчы Паспалітай, што аўтаматычна надзяляе яе шэрагам атрыбутаў і якасцей, у тым ліку і існаванне ў дзяржаўных межах, якія былі значна шырэйшымі за этнаграфічныя межы польскага народа. Настойлівае імкненне Польшчы адыгрываць ролю, на якую яна ў выніку сваёй відавочнай слабасці прэтэндаваць не магла, вымушалі іншых суб'ектаў міжнароднай палітыкі і, у першую чаргу, яе суседзяў, ставіцца да яе з насцярожанасцю.

Замацаванае ў палітычных праграмах польскіх нацыянальных дэмакратаў (эндэкаў) і пілсудчыкаў патрабаванне далучэння да Польшчы няпольскіх тэрыторый, захопніцкая палітыка, якая актыўна рэалізоўвалася на практыцы, псавалі адносіны Польшчы са сваімі апекунамі. Аднак яе зацятая варожасць да Расіі і камунізма вымушала іх «скрозь пальцы» глядзець на свавольствы польскіх кіраўнікоў.

Між тым, у міжнародных палітычных стасунках адроджаная Польшча паводзіла сябе даволі нахабна і здолела ў вельмі кароткі час парадзіць шмат нядобразычліўцаў з ліку суседзяў, якіх так ці інакш пакрыўдзіла ў час барацьбы за ўстанаўленне сваёй усходняй мяжы. Адной з галоўных ахвяр польскай экспансіі сталі беларусы. Анексія Заходняй Беларусі, ператварэнне Польшчай сваіх беларускіх падданых у грамадзян «другога гатунку», барацьба з беларускімі арганізацыямі, палітыка паланізацыі і многае іншае вынікам сваім мела тое, што характар успрымання Польшчы беларусамі – як усходнімі, так і заходнімі – быў, мякка кажучы, нядобразычлівым. І трэба падкрэсліць асоба – нягледзячы на тое, што ўсходнія беларусы, у адрозненне ад заходніх, знаходзіліся пад магутным уздзеяннем бальшавіцкай ідэалогіі і прапаганды, якая стварала вобраз бела-панскай, класава варожай Польшчы. Эмацыйна-псіхалагічнай асновай успрымання Польшчы заходнімі беларусамі стаў нацыянальны ўціск, пад цяжарам якога яны знаходзіліся.

З часу польска-савецкай вайны савецкая прапаганда актыўна працавала над стварэннем вобраза Польшчы – баявога авангарда дзяржаў Антанты, увесь сэнс існавання якога складаўся ў зацятай барацьбе з Савецкай Расіяй. У гэты вобраз аператыўна ўносіліся карэктывы ў адпаведнасці з тымі зменамі, якія адбываліся ў самой Польшчы і ў свеце. У рамках антыпольскага выхавання мас шмат увагі ўдзялялася дзеянням польскіх уладаў на анэксаваных беларускіх землях. А.А. Савіч, даследуючы адлюстраванне палітыкі Польшчы ў Заходняй Беларусі ў беларускай гістарыяграфіі 20-х – першай паловы 50-х гг. XX ст., канстатуе: «У сваім антыпольскім запале <…> аўтары вельмі часта дэманстравалі высокую ступень эмацыйнасці на падставе гіпербалізацыі і дэманізацыі фактаў нядобразычлівага стаўлення польскіх урадоўцаў да беларускага насельніцтва; шырока выкарыстоўваліся яркія мастацкія прыёмы і звароты» [1, с. 19]. У свядомасць савецкіх беларусаў, якія шчыра спачувалі сваім заходнім братам, прывівалася ідэя аб будучым краху польскай дзяржавы і аб немінучым уз'яднанні Беларусі і беларускага народа. Асноўная роля ў ідэалагічнай і прапагандысцкай апрацоўцы насельніцтва адводзілася тагачасным друкаваным выданням, разлічаным на масавага чытача. На часопісы і газеты была ўскладзена задача па фарміраванню ва ўспрыманні савецкіх беларусаў негатыўнага вобраза Польшчы. Дарэчы, яе знешняя палітыка, характар паводзін на міжнароднай арэне давалі шмат падстаў пазіцыянаваць яе як задзіру, падбухоршчыка новай вайны, у якую капіталістычныя дзяржавы, стаяўшыя, вобразна кажучы, за спіной Польшчы, хацелі ўцягнуць СССР.

Аб'ектыўны погляд на тое, што магло стаць і стала ў рэшце рэшт факталагічнай і эмацыйна-псіхалагічнай базай такога вобраза, дае падставы лічыць, што ў Савецкай Беларусі, якая знаходзілася на передавой лініі супрацьстаяння паміж СССР і «сусветным імперыялізмам», было правільнае разуменне выконваемай Польшчай ролі. Аднак,

абсалютызуючы антысавецкі кірунак знешняй палітыкі Польшчы і лічачы яго ледзьве не сэнсам існавання незалежнай Польшчы, мадэратары працэса фарміравання яе вобраза ў свядомасці савецкіх беларусаў не звярталі ўвагі на ўсе астатнія яе кірункі.

У Заходняй Беларусі беларускія грамадзяне Польшчы таксама не схільны былі разглядаць яе ў вобразе «голуба міру». Аднак заходнебеларускі друк, у адрозненне ад беларускага савецкага, пазбягаў тлумачэння тых ці іншых знешнепалітычных акцый Польшчы з дапамогай формулы аб «антысавецкім фронце імперыялістычных дзяржаў», а падставы для сваіх заключэнняў знаходзіў у польскай гістарычнай традыцыі і нацыянальным характары палякаў.

Цяжка спрачацца з тым фактам, што першыя ж гады існавання «адроджанай з попелу» Польшчы паказалі, што адрадзілася і былая яе ваяўнічасць. Часопіс нацыянал-дэмакратычнага кірунку «Крывіч» у пачатку 1923 г. канстатаваў: «Польскія адносіны да нас цяпер не толькі не супярэчаць польскай мінуўшчыне, але наадварот, прыродна вынікаюць з яе» [2, с. 41]. Прадстаўнікі беларускага гармадска-палітычнага руху ў Заходняй Беларусі лічылі, што вялікім дзяржавам незалежная і дастаткова моцная Польшча была патрэбна як фактор стрымлівання бальшавізму. Таму ў вырашэнні пытанняў, звязаных з афармленнем сваёй усходняй граніцы, яна заўсёды будзе знаходзіць маральную падтрымку гэтых дзяржаў. У астатнім жа Польшча будзе праводзіць самастойную знешнюю палітыку, абараняючы свае, а не чужыя дзяржаўныя інтарэсы. У адрозненне ад савецкіх вобразатворцаў, іх заходнебеларускія калегі лічылі, што ў аснове знешняй палітыкі адроджанай Польшчы ляжаў прынцып вялікадзяржаўнасці. Ён базаваўся на перакананні, што Польшча адрадзілася ў выніку гераічнай барацьбы польскага народа за незалежнасць. А паколькі ні адна дзяржава ў пачатку вайны не ставіла сабе ў задачу адраджэнне Польшчы, яна «паўстала з мёртвых» насуперак усім, змагаючыся не толькі з непасрэдным ворагам, але і з палітыкай усіх галоўных саюзных дзяржаў [3, s. 18]. Гэта, як лічылі палякі, давала Польшчы права на незалежную ўнутраную і знешнюю палітыку. Акрамя таго, у адпаведнасці са словамі аднаго з найбольш уплывовых прадстаўнікоў польскай грамадска-палітычнай думкі канца XIX–XX ст., лідэра эндэкаў Рамана Дмоўскага, Польшча проста абавязана была стаць вялікай дзяржавай. Ён заяўляў: «Для кожнага, хто хоць як-небудзь разумеў палітычную геаграфію Еўропы, павінна быць ясна, што на той зямлі, дзе канчаецца Заходняя Еўропа <…> месца малой, слабай дзяржаве, размешчанай паміж Германіяй і Расіяй няма» [4, s. 288–289].

Дарэчы, нягледзячы на тое, што Пілсудскі быў палітычным апанентам Дмоўскага, на практыцы ён усё ж вымушаны быў рэалізоўваць палітычную праграму эндэкаў, бо яго ўласныя ідэі былі адарванымі ад жыцця – адрадзіць Польшчу як федэратыўную дзяржаву, якой у мінулым была Рэч Паспалітая, было немагчыма. І хаця ваенная сіла была за Пілсудскім, з яго тагачаснай схільнасцю да польска-літоўскага гістарычнага рамантызму, большасць палякаў падзяляла погляды халоднага рэаліста Дмоўскага, якія базаваліся на натуральнай этнічнай логіцы палякаў. Таму Пілсудскаму прыйшлося будаваць новую Польшчу як нацыянальную рэспубліку для палякаў на польскім этнарэлігійным падмурку.

Нацыяналістычная канцэпцыя Дмоўскага грунтавалася, перш за ўсё, на польскіх гістарычных традыцыях, а таксама на прынцыпах «сацыяльнага дарвінізму». «Асновай жыцця» ў грамадстве абвяшчалася барацьба, а натуральны адбор (войны, гвалт, знішчэнне) – рухаючай сілай гісторыі. З гэтага рабілася выснова, што нацыі, якія перасталі змагацца, маральна выраджаюцца і распадаюцца [5]. Дмоўскі лічыў, што лепшым каталізатарам працэсу фарміравання польскай нацыі з'яўляюцца ідэі антысемітызму і ксенафобіі. Да таго ж ён разглядаў сацыялізм як рух, створаны яўрэямі з мэтай дасягнення інтарэсаў сваёй нацыі. Такім чынам, антысемітызм і антыбальшавізм у адроджанай Польшчы дапоўнілі складнікі польскасці ў актуальнай для таго часу яе трактоўцы.

Вобразатворцы Заходняй Беларусі, таксама як і іх калегі з БССР, звярталі ўвагу на ваяўнічасць Польшчы. Аднак тлумачылі яе не антысавецкім комплексам, які, нібыцам, рухаў палякамі, а комплексам антырасійскім. У аснове іх заключэнняў ляжаў відавочны факт – Польшча, вырашаючы пытанне сваёй усходняй мяжы, уступіла ва ўзброены канфлікт з Літвой і Украінай, якія самі стаялі на шляху адшукання незалежнасці і не неслі адказнасці за Расію. Прычым зрабіла гэта не звяртаючы ўвагі на пазіцыю вялікіх дзяржаў [6, s. 23]. Акрамя таго, палякі мелі намер уступіць ва ўзброены канфлікт нават з «белай» Расіяй, калі б тая перамагла бальшавікоў і паспрабавала аднавіць Расію ў былых яе межах [7].

Беларускі грамадскі часопіс «Покліч», які выдаваўся ў Коўне, у 1926 г. даў базавую характарыстыку Польшчы як суб’екта міжнароднай палітыкі: «Ачнуўшыся ад векавой дрымоты, польскі нацыянальны шавінізм і дзяржаўны імперыялізм <…> Гэты ненасытны спрадвечны вампір паядае польскі працоўны народ і марнуе жыццё суседзяў шляхецкай няўрымслівай Польшчы. Пілсудскі – жывы адбітак векавечных мрыяў польскай мегаламаніі» [8, с. 5]. У сваім нумары ад 1 кастрычніка 1926 г. «Покліч» прадоўжыў сваю вобразатворчую працу: «Уваскросшая Польшча зрабілася “гіблым месцам”, пагражаючым не толькі сабе, а і сваім суседзям. “Знятая з крыжа” Польшча стала катам, турмой сумежных народаў. Польшча жыве настроямі мінуўшчыны – у сваім летаргічным сне яна кіруецца ідэаламі мінулых стагоддзяў. Польшча прызвычаілася панаваць над “быдлам”. Але ў сучасным жыцці <…> Польшча хутка заўважыць і адчуе, што панаваць няма над кім» [9, с. 5].

Часопіс «Рунь» канстатаваў, што Польшча мела партнёрскія адносіны стратэгічнага характару толькі з Францыяй. Вялікабрытанія ж і ЗША былі праціўнікамі «вялікай Польшчы», дапускаючы яе толькі ў этнаграфічных, а не ў «гістарычных» межах [10]. Як яшчэ ў 1920 г. заключала газета «Беларусь» (выдавалася ў час акупацыі Мінска польскімі войскамі Часовым беларускім нацыянальным камітэтвам – А.К.), палітычная думка Вялікабрытаніі была супраць «вялікай Польшчы», бо такая Польшча не магла быць моцнай [11]. Яе апекуны, як сталыя палітычныя гульцы, не дэманстравалі трапяткога стаўлення да Польшчы і не спяшаліся прызнаваць яе ўсходнюю граніцу, бо лічылі часовай – да моманту «адраджэння буржуазнай Расіі». І толькі канчаткова страціўшы веру ў гэтае адраджэнне і пераканаўшыся, што Польшчы наканавана больш доўгае жыццё, чым здавалася раней, дзяржавы Антанты змянілі сваё стаўленне да яе. 13 сакавіка 1923 г. на Канферэнцыі паслоў Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі і Японіі дэ-факта была прызнана мяжа Польшчы з Літвой і СССР [12, s. 123]. Газета «Звязда» адзначыла, што гэты дзень заходнееўрапейская прэса абвясціла днём нараджэння «вялікай Польшчы» [13].

Заходнія беларусы, якія сталі яе грамадзянамі, бачылі знутры «палітычную кухню» Польшчы і прыходзілі да высновы, што не толькі ў ёй самой, але і побач з ёю кожнаму непаляку, – будзь то літовец, беларус, яўрэй ці ўкраінец, – жыцця не будзе [14, с. 10].

Вялікадзяржаўныя амбіцыі Польшчы прычынялі непакой не толькі яе ўсходнім суседзям. Яны вельмі сур’ёзна псавалі яе адносіны з Германіяй [15], [16, s. 13–15]. Нягледзячы на падтрымку дзяржаў Антанты, Польшча вымушана была ўступіць ёй землі з большасцю польскага, крыху анямечанага насельніцтва. Тым самым яе наступ на захад захлынуўся і ідэя «вялікай Польшчы» адкацілася, як канстатавала газета «Наш сцяг» (орган Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў – А.К.) у бок найменшага адпору – на ўсход [17]. Аднак у склад Польшчы ўсё ж увайшлі тэрыторыі былой Прусіі з высокай сельскагаспадарчай культурай і развітай прамысловасцю [18]. Прысутнасць тут этнічных немцаў стала для палякаў праблемай, якую яны вырашалі тым жа спосабам, што і на «ўсходніх крэсах» – шляхам іх дыскрымінацыі і прымусовай асіміляцыі. Пазней, у час «мытнай вайны» паміж Польшчай і Германіяй (з чэрвеня 1925 г. па сакавік 1934 г.), частка нямецкага насельніцтва была выселена з Польшчы. Да гэтай вайны, дарэчы, прывялі спробы Польшчы размаўляць з Германіяй «на роўных». Аднак яе кіраўнікі, нягледзячы на пафаснае стаўленне палякаў да сваёй дзяржавы і погляд на яе як на «вялікую», лічылі Польшчу «сезоннай дзяржавай» і свае адносіны з ёй будавалі зыходзячы з гэтага [19, s. 146]. А паколькі пасля заключэння ў красавіку 1922 г. трактату ў Рапала Германія і Расія пачалі зближацца, гэта ўваскрасала ў памяці палякаў успаміны аб расійска-прускім супрацоўніцтве супраць Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст., якое прывяло да яе падзелаў.

Напярэдадні канферэнцыі ў Лакарна, якая афіцыйна праводзілася ў мэтах канчатковага «прымірэння Еўропы» пасля Першай сусветнай вайны, Польшча, адчуваючы пагражаючую ёй небяспеку, шукала падтрымку. Аднак дарэмна: Лакарнскія дамовы падзялілі еўрапейскія межы на заходнія, на якія распаўсюджваліся міжнародныя гарантыі, што рабіла іх непарушнымі, і ўсходнія (для Германіі), у стаўленні да якіх ніякіх гарантый не было выдадзена. Усім было відавочна, што гэта парушала бяспеку Польшчы. Выдаваемая ў Вільні ад імя Беларускай сялянска-работніцкай грамады газета «Жыццё беларуса» канстатавала, што ў Лакарна «Польшча была пабіта смяротна», таму як «польска-французская гарантыйная

ўмова, не падпісаная нікім, апрача іх, і не абавязвала ні да чаго» [20, с. 3]. Дэ-факта з заключэннем Лакарнскіх пагадненняў страціў сваю сілу заключаны ў 1921 г. франка-польскі саюз, таму як парушэнне германа-французскай мяжы аўтаматычна вяло да ўмяшання краін-гарантаў (Вялікабрытаніі і Італіі). Усе спробы Польшчы ліквідаваць гэты пралом у сістэме сваёй бяспекі атрымалі рашучы адпор з боку Германіі.

Пасля дзяржаўнага перавароту, які адбыўся ў Польшчы ў мае 1926 г., і ўстанаўлення аўтарытарнага рэжыму санацыі ў беларускіх вобразатворцаў узніклі падставы для атаясамлівання яго з фашысцкім рэжымам, які з кастрычніка 1922 г. існаваў у Італіі. У 1925 г. правадыр італьянскіх фашыстаў Беніта Мусаліні абвясціў сябэ «дучэ» (ад лат. dux – «лідэр, правадыр»). Адпаведную ролю ў тагачаснай Польшчы выконваў Юзаф Пілсудскі. У якасці фігуры, якая адыграла ключавую ролю ў адраджэнні Польшчы, і як Кіраўнік дзяржавы (Naczelnik Państwa) з 14.11.1918 г. да 14.12.1922 г., Пілсудскі пазіцыянаваўся яго прыхільнікамі як правадыр палякаў. І хаця ў канцы 1922 г. апошні фармальна адыйшоў ад палітычнай дзейнасці, стаяць у баку ад працэсаў, якія праходзілі ў Польшчы, ён не жадаў. Прыняўшы актыўны ўдзел у Майскім пераvароце, Пілсудскі фактычна становіцца дыктатарам Польшчы. З гэтага часу актывізаваўся працэс фарміравання культу асобы, у рамках якога Пілсудскі разглядаўся як правадыр (wodż) польскай нацыі [21]. А калі і ў Германіі да ўлады прыйшлі нацысты і пачаўся працэс збліжэння паміж ёю і Польшчай, які завяршыўся падпісаннем 26 студзеня 1934 г. пакта «Гітлера–Пілсудскага», вельмі карыснага для Гітлера, падстаў для таго, каб атаясамліваць пілсудчыкаў з фашыстамі ў беларускіх вобразатворцаў з'явілася яшчэ больш. Аб удзячнасці Гітлера Пілсудскаму сведчаць многія факты. У тым ліку і пісьмо яго жонцы, Александры, са спачуваннем у сувязі са смерцю Пілсудскага (12 мая 1935 г.) і абяцаннем назаўжды захаваць вобраз памерлага «ў сваёй удзячнай памяці» [22].

Аб'ектыўна Пілсудскі імкнуўся пазбегнуць чарговага падзелу Польшчы, пагроза якога літаральна «лунала ў паветры». Ён не гарэў жаданнем апынуцца «паміж молатам і кавадлам», а паколькі лічыў, што галоўная пагроза Польшчы зыходзіць з боку СССР (насуперак заключэнню сваіх ваенных саветнікаў), то зрабіў стаўку на Германію, якая пасля прыходу да ўлады Гітлера пачала актыўна рыхтавацца (і тут Пілсудскі не памыляўся) да паходу на ўсход. Пры гэтым Польшча пачала аддаляцца ад сваёй саюзніцы, Францыі: у 1932 г. Польшчу вымушана была пакінуць французская ваенная місія, а ў 1934 г. і ваеннае супрацоўніцтва Польшчы з Францыяй было цалкам спынена [23].

Перамены, якія адбываліся ў знешнепалітычным курсе Польшчы, не заставаліся незаўважанымі ў БССР. Было відавочна, што кожны новы яе «сябар» і партнёр з'яўляўся такім жа яго ворагам СССР, якім была і сама Польшча. Таму прапагандысцкія памкненні беларускай савецкай (як і ўвогуле савецкай) прапаганды былі накіраваны на выкрыццё дыпламатычнай і ваеннай падрыхтоўкі Польшчы да вайны з СССР.

У Заходняй Беларусі ваенныя прыгатаванні Польшчы і пошукі ёю новых партнёраў таксама знаходзілі адпаведную ацэнку. Часопіс «Крывіч», у прыватнасці, пераконваў сваіх чытачоў: «Усходнія межы Польшчы не абапіраюцца ні на гістарычныя, ні на геаграфічныя падставы. Яны з'яўляюцца штучнымі і выпадковымі. Яны заўсёды будуць жывою ранаю на усходзе Еўропы, якую не загояць ніякія лекі» [24, с. 50]. Па гэтай жа прычыне часопіс «Покліч» заяўляў, што Польшча – гэта «гнайнік, марны нашчадак Версалі і Рыгі» [25, с. 3], які пагражаў сваім існаваннем еўрапейскаму міру. Каментуючы майскі пераварот, «Покліч» заклікаў еўрапейскія дзяржавы: «Выявіўся ўзгадаваны імперыялізмам Польшчы гаручы матэрыял, які толькі чакае належнай іскры, каб крывавае зарава запалала па ўсёй Еўропе. Усведамлёныя жыццём еўрапейскія палітычныя колы не маюць права і далей "умываць рукі" ад гэтай небяспекі, калі не жадаюць абяскроўлення кантынента. Еўропа павінна вылечыцца. Павінны быць зліквідаваны падставы для нацыянальнага гвалту і надужыцця. Павінна быць зроблена "дэзынфекцыя" ад заразы – заваёўніцкіх, каланізатарскіх тэндэнцый – мегаламаніі польскай шляхты» [25, с. 3–4].

Заходнебеларускі друк не аднойчы звяртаўся і да тэмы польска-чэхаславацкіх адносін, вельмі складаных з-за прэтэнзій Польшчы на Цешынскую вобласць. Чэхаславакія была падтрымана заходнімі дзяржавамі, прадстаўнікі якіх узялі на сябе вырашэнне польска-чэхаславацкай спрэчкі. 28 ліпеня 1920 г. у Спа (Бельгія) была падпісана завяршальная дамова

паміж Польшчай і Чэхаславакіяй, па якой заходняя частка спрэчнай вобласці была пакінута за Чэхаславакіяй, тады як Польшча атрымала ўсходнюю яе частку [26]. Аднак такі падзел Польшчу не задаволіў і яна стала чакаць моманту, каб вярнуцца да спрэчкі.

У пачатку гэтага канфлікту і беларускі савецкі, і заходнебеларускі перыядычны друк у адзін голас пераконвалі, што прэтэнзіі Польшчы не абгрунтаваныя нічым рэальна і сцвярджалі, што яе паводзіны з’яўляюцца дэвіянтнымі. Так, напрыклад, часопіс «Беларускі сцяг» заяўляў, што яны «нагадвалі ўчынкі хворага, амаль вар’ята, які сваімі бязглуздымі выкрыкамі ўжо абрыдзеў» [27, с. 28]. «Савецкая Беларусь», у сваю чаргу, перадрукоўвала матэрыялы чэшскай прэсы нават без каментарыяў: «Мы яшчэ ніколі не былі сведкамі такой сляпой і неінтэлігентнай палітыкі <…> Гэта не толькі непрыстойна і недапушчальна, але нават неразумна <…> Нам гэта ўжо абрыдла» [28].

Між тым Варшава ўсё ж свайго дачакалася… Калі Гітлер задумаў адабраць у Чэхаславакіі Судзецкую вобласць, яна адрэагавала вокамгненна, прапанаваўшы таму аказаць падвойнае ўздзеянне як па судзецкім, так і па цешынскім пытаннях. І знайшла поўнае разуменне з боку Берліна. У рэшце рэшт, 30 верасня 1938 г., адразу ж пасля падпісання ў ноч з 29 на 30 верасня Мюнхенскай дамовы паміж Германіяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй і Італіяй, Варшава прад’явіла чэхаславацкаму ўраду новы ультыматум, дзе патрабавала неадкладнага задавальнення сваіх патрабаванняў. А ўжо 2 кастрычніка польскія войскі акупавалі Цешынскую вобласць [26].

Такім чынам, аднанакіраванымі намаганнямі беларускія савецкія і заходнебеларускія вобразатворцы стварылі негатыўны вобраз Польшчы як суб’екта міжнароднай палітыкі і міжнародных адносін. Гэты вобраз стаў дзейнасным інструментам інфармацыйна-ідэалагічнай і прапандысцкай работы, якая вялася ў БССР, а таксама сярод беларускага насельніцтва анэксаванай Польшчай Заходняй Беларусі. Ён садзейнічаў развіццю этнапалітычнай свядомасці беларусаў, мабілізацыі беларускай грамадскай думкі на карысць будучага ўз’яднання Беларусі і беларускага народа, упэўненасці ў непазбежнасці гэтага аб’яднання і гатоўнасці садзейнічаць яго набліжэнню.

## Літаратура

1. Савіч, А. А. Палітыка Польшчы і становішча Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі 1920-х – першай паловы 1950-х гг. / А. А. Савіч // Веснік Брэсцкага універсітэта. Сер. 2 : Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2018. – № 2. – С. 13–22.

2. Скарыніч, Б. Думкі і разважанні. Дзве праўды / Б. Скарыніч // Крывіч. – 1923. – № 1. – С. 39–42.

3. Lukasiewicz, J. Polska jest mocarstwem / J. Lukasiewicz. – Warszawa : Nakład Gebethnera i Wolffa, 1939. – 63 s.

4. Landau, Z. Polska w Europe i świecie, 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Wiedza Powszechna, 1984. – 316 s.

5. Зелинский, М. В. Роман Дмовский как идеолог и теоретик польского национализма [Электронный ресурс] / М. В. Зелинский. – Режим доступа : https://zapadrus.su/61-slm/2354-roman-dmovskij-kak-ideolog-i-teoretik-polskogo-natsionalizma.html. – Дата доступа : 12.06.2024.

6. Kirkien, L. Russia, Poland and the Curzon line / L. Kirkien. – Edinburgh : Caldra house, 1945. – 67 s.

7. Juzwenko, A. Stosunek «Białej» Rosji do odradzającego się państwa polskiego i jego granic / A. Juzwenko // Kwartalnik Historyczny. – 1973. – № 3. – S. 621–639.

8. Пуцята. Аб арыентацыях / Пуцята // Покліч. – 1926. – б/н. – С. 4–5.

9. Пуцята. Літоўска-савецкі дагавор і яго перспектывы / Пуцята // Покліч. – 1926. – № 6 (8). – С. 3–5.

10. Петрашкевіч, А. Лёс Беларусі / А. Петрашкевіч // Рунь. – 1920. – № 1. – С. 7.

11. Польшча і яе міжнародны стан // Беларусь. – 1920. – 13 мая. – С. 1.

12. Srebrakowski, A. Sejm Wileński 1922 roku. Idea i jej realizacja / A. Srebrakowski. – Wrocław : Wyd-wo Un-tu Wrocławskiego, 1993. – 145 s.

13. Домбаль, Т. Польский империялизм / Т. Домбаль // Звезда. – 1923. – 18 мая. – С. 2.

14. Бяроза, А. Расійска-польскі баль і беларускае пахмелле : (куды ідзе беларускі шлях) / А. Бяроза. – Пінск : Гасла, 1921. – 14 с.

15. Rosenfeld, G. Stosunki politzcyne polsko-niemieckie po Rapallo i Locarno / G. Rosenfeld // Kwartalnik Historzcyny. – 1963. – № 1. – S. 35–51.

16. Wojdyło, W. Wizja miejsca Polski w Europie 1918–1945 w myśli politycznej Stanislawa Grabskiego / W. Wojdyło // Dzieje Najnowsze. – 1994. – № 1. – S. 13–25.

17. Змагаймася! // Наш сцяг. – 1923. – 30 чэрвеня. – С. 1–2.

18. «Платон – прыяцель, але праўда яшчэ большы прыяцель» // Беларусь. – 1920. – 8 сакавіка. – С. 1.

19. Wroniak, Z. Zbliżenie francusko-niemieckie a problem polskiej granicy zachodniej w latach 1925–1932 / Z. Wroniak // Problem granic i obszaru odrodzonego państwa polskiego, 1918–1990. – Poznań : Wyd-wo Naukowe Un-tu im. A. Mickiewicza, 1992. – S. 141–154.

20. Сойм // Жыццё беларуса. – 1925. – 28 кастрычніка. – С. 2–3.

21. Ціхаміраў, А. Пілсудскі / А. Ціхаміраў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭН, 1999. – Т. 5. М–Пуд / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – С. 493.

22. Хавич, О. «Юзефу от друга Адольфа» : за что Пилсудский удостоился панихиды от Гитлера [Электронный ресурс] / О. Хавич. – Режим доступа : https://ukraina.ru/20230512/1046135966.html?ysclid=lxa27xvj7r602016100/. – Дата доступа : 11.06.2024.

23. Валентинов, О. Как Пакт Гитлера–Пилсудского открыл путь к войне в Европе [Электронный ресурс] / О. Валентинов. – Режим доступа : https://nstarikov.ru/kak-pakt-gitlera-pilsudskogo-otkryl-put-k-vojne-v-evrope-117737?ysclid=lwvt45arbd974710950. – Дата доступа : 01.06.2024.

24. Агляд прэсы // Крывіч. – 1923. – № 1. – С. 50–55.

25. Пуцята. Новы сейм і палітычная сітуацыя / Пуцята // Покліч. – 1926. – б/н. – С. 1–4.

26. Самсонов, А. Два хищника – Польша и Германия – против Чехословакии [Электронный ресурс] / А. Самсонов. – Режим доступа : https://topwar.ru/6015-dva-hischnika-polsha-i-germaniya-protiv-chehoslovakii.html?ysclid=lxg9gvilzv879261588. – Дата доступа : 12.06.2024.

27. Агляд прэсы // Беларускі сцяг. – 1922. – № 1. – С. 28–32.

28. Чэхі аб Польшчы // Савецкая Беларусь. – 1923. – 29 чэрвеня. – С. 1.

Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 12.06.2024